*Сямешка Л. І.*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск, Беларусь

*Siameshka L. I.*
National Institute for Higher Education, Minsk, Belarus

**УДК 811.161.3:37.014.53:327.3**

# «СІСТЭМА СЕРТЫФІКАЦЫІ ЎЗРОЎНЯЎ ВАЛОДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ ЯК ЗАМЕЖНАЙ»: АДУКАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ У РАЗВІЦЦІ МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ГАЛІНЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ

# EDUCATIONAL POTENTIAL OF “BELARUSIAN LANGUAGE PROFICIENCY LEVELS CERTIFICATION SYSTEM” IN DEVELOPMENT OF INTERNATIONAL COOPERATION IN THE FIELD OF CONTINUING EDUCATION

*У дакладзе прапануецца аналіз пытанняў выкарыстання адукацыйнага патэнцыялу «Сістэмы сертыфікацыі ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай» дзеля пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне дадатковай адукацыі і павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў беларускай мовы як замежнай. Акрэсліваецца шэраг праблем у гэтай сферы і разглядаюцца шляхі іх вырашэння на прыкладзе праграмы павышэння кваліфікацыі «Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай».*

*Ключавыя словы: беларуская мова як замежная; сістэма сертыфікацыі ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай; міжнароднае супрацоўніцтва; дадатковая адукацыя; акадэмічная мабільнасць.*

*The paper covers application and usage of Belarusian Language Proficiency Levels Certification System for the purpose of expanding international cooperation in the field of continuing education and enhancing the skills and qualifications of the teachers of Belarusian as a foreign language. The paper discusses the existing problems in this field and looks at the ways to solve them, taking “Methods of Teaching Belarusian as a Foreign Language” continuing education program as an example.*

*Key words: Belarusian as a Foreign Language; Belarusian language proficiency levels; Belarusian language proficiency certification; international cooperation; continuing education; academic mobility.*

Працэсы стандартызацыі і інтэрнацыяналізацыі адукацыі, заснаваныя на ідэі ўніверсальнасці ведаў і працэсу пазнання, актуалізавалі распрацоўку навуковых праектаў і адукацыйных праграм па беларускай мове як замежнай (далей – БМЗ), адаптаваных да міжнародных стандартаў і арыентаваных на мадэрнізацыю навучання і развіццё мабільнасці суб’ектаў адукацыйнага працэсу. Сістэмнае пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва і забеспячэнне на ўзроўні сусветных стандартаў адукацыйных паслуг па БМЗ як у межах традыцыйных ступеняў адукацыі, так і ў галіне дадатковага навучання дарослых ёсць адна з задач праграмы распрацоўкі і ўкаранення Нацыянальнай сістэмы сертыфікацыі ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай –

інавацыйнай педагагічнай тэхналогіі, якая дазваляе аб'ектыўна вымераць і ацаніць узроўні беларускамоўнай кампетэнцыі замежных навучэнцаў/карыстальнікаў беларускай мовай незалежна ад месца, часу і формы яе вывучэння.

Функцыянальная лінгваметадычная база сертыфікацыйных узроўняў валодання БМЗ, распрацаваная ў фармаце нарматыўна-адукацыйнага комплексу ў рамках навуковага даследавання «Распрацоўка адукацыйных стандартаў і тыпавых тэстаў па беларускай і рускай мовах як замежных» (2016–2020 гг.), стварае неабходны ўзровень рэсурснага забеспячэння працэсу навучання БМЗ з далейшай сертыфікацыяй узроўняў сфарміраванай беларускамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі. Асноўнымі складнікамі нарматыўна-адукацыйнага комплексу выступаюць «*Стандарты экзаменацыйных патрабаванняў да ўзроўняў кампетэнцыі ў беларускай мове*», якія рэгламентуюць уменні і навыкі, неабходныя замежнаму навучэнцу, каб карыстацца беларускай мовай на тым ці іншым узроўні і/ці здаць сертыфікацыйны экзамен пэўнага ўзроўню, і сістэма лінгвадыдактычных тэстаў (*Тэст па беларускай мове як замежнай – ТБМЗ*), прызначаных для вымярэння і ацэнкі кожнага з шасці ўзроўняў набытай кампетэнцыі.

Стандартызацыя патрабаванняў да ўзроўняў валодання беларускай мовай і ўсталяванне аналагічных з еўрапейскімі тэставых спосабаў пацвярджэння узроўняў беларускамоўнай кампетэнцыі з'яўляецца вызначальным чыннікам для пашырэння міжнародных навукова-педагагічных кантактаў і актывізацыі супрацоўніцтва з адукацыйнымі ўстановамі ў краінах, дзе вывучаецца беларуская мова. Лінгвадыдактычнае апісанне мадэлі беларускамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі як адукацыйнага выніку, змест і структура якой класіфікуецца на 6 узроўняў, забяспечвае празрыстасць курсаў, праграм навучання беларускай мове ў розных лінгвакультурных кантэкстах, ствараючы такім чынам умовы для ўвядзення беларускай мовы ў сферу міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне вывучэння сучасных моў. Магчымасць атрымаць сертыфікат валодання беларускай мовай спрыяе матывацыі яе далейшага вывучэння і садзейнічае падтрымцы і развіццю акадэмічнай мабільнасці кантынгенту іншаземцаў, якія вывучаюць беларускую мову як у беларускім маўленчым асяроддзі, так і ва ўмовах яго адсутнасці.

Адукацыйны патэнцыял і эфектыўнасць праграмы сертыфікацыі ўзроўняў валодання камунікацыяй на беларускай мове, якая ацэньваецца ў кантэксце рэалізацыі функцый установы адукацыі як у плане ажыццяўлення міжнароднага акадэмічнага супрацоўніцтва, так і ў аспекце яе знешнеэканамічнай дзейнасці, вызначаецца шэрагам крытэрыяў, сярод якіх акадэмічная мабільнасць студэнтаў і выкладчыкаў, міжнародны імідж установы адукацыі, аб'ём сродкаў ад экспарту адукацыйных паслуг і інш. Аднак паспяховая яе рэалізацыя залежыць найперш ад якасці адукацыйных паслуг і міжнароднага прызнання кваліфікацыйных характарыстык і выда-

дзеных у Беларусі сертыфікатаў аб выніках навучання. Шматпланавае паняцце «якасць адукацыі» ў кантэксце інтэграцыйных працэсаў падразумявае такія складнікі, як якасць кіравання адукацыйным працэсам, якасць кантролю ацэнкі і працэсу ацэньвання, якасць навучальных сродкаў, а таксама якасць кантынгенту навучэнцаў і выкладчыцкага складу. Апошняе патрабуе асаблівай увагі, бо, нягледзячы на значную запатрабаванасць у міжнароднай адукацыйнай прасторы беларускай мовы як галіны ведаў і прадмета вывучэння, у айчыннай сістэме адукацыі яна застаецца інстытуцыйна нерэгламентаванай дысцыплінай. Праз адсутнасць мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтай галіне на сённяшні дзень не дастае навукова-метадычных распрацовак і канцэптуальных даследаванняў, якія адлюстроўвалі б розныя аспекты БМЗ у кантэксце дыдактычнай трыяды (вывучэнне, выкладанне, ацэнка), назіраецца пэўнае адставанне тэарэтычнага асэнсавання назапашанага айчыннага і міжнароднага эмпірычнага досведу ў галіне камунікатыўна арыентаванага навучання і тэставых тэхналогій кантролю. Сутнасць навучання мове з пазіцый сучаснай дзейнаснай узроўневай парадыгмы якраз заключаецца ў неабходнасці выкарыстання інавацыйных метадаў авалодання мовай і тэставых спосабаў вымярэння дасягненняў навучэнцаў. Кожнаму выкладчыку БМЗ даводзіцца вырашаць ва ўмовах метадалагічнага «дэфіцыту» шэраг метадычных прафесійных задач у канкрэтных педагагічных сітуацыях, звязаных з фарміраваннем станоўчых матываў вывучэння беларускай мовы, развіццём маўленчых уменняў і навыкаў (дыялагічнага і маналагічнага маўлення, аўдыявання, чытання, пісьма), з вызначэннем аб’ектыўных крытэрыяў ацэнкі вучэбных дасягненняў і інш.

У сувязі з адзначаным уяўляецца важным стварэнне праграм навучання ў галіне дадатковай адукацыі (у тым ліку ў рамках кароткатэрміновых курсаў, модульных курсаў і інш.), якія адлюстроўвалі б новыя канцэптуальныя падыходы да праектавання зместу навучання і дакладнага прагназавання адукацыйных вынікаў з арыентацыяй на матывацыйныя асновы навучання, на аптымальны ўлік мэтаў, матываў, інтэнцый навучэнцаў і іх кагнітыўных магчымасцей. На сённяшні дзень у рамках дзейнасці Вучэбнага цэнтра міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» распрацавана праграма павышэння кваліфікацыі «Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай» (Л. Сямешка, Т. Сандалава). Яна мае на мэце павышэнне метадычнай эрудыцыі выкладчыкаў БМЗ праз актуалізацыю інавацыйных спосабаў арганізацыі навучання і асэнсаванне заканамернасцей, што ляжаць у аснове сучасных педагагічных тэхналогій і псіхалогіі навучання дарослых (тэорыя паэтапнага фарміравання кагнітыўных дзеянняў, «вучэбны цыкл», мадэль навучання (David A. Kolb).

Канцэпцыя праграмы павышэння кваліфікацыі прадугледжвае далучэнне да адукацыйнага працэсу замежных адмыслоўцаў-практыкаў, што стварае магчымасць для абмену досведам па актуальных пытаннях

тэорыі і практыкі выкладання БМЗ і дазваляе выкладчыкам, экзамената-рам, адміністратарам асэнсаваць сваю працу і скаардынаваць намаганні, накіраваныя на задавальненне рэальных патрэб навучэнцаў.

Акрамя ўсебаковага аналізу арганізацыйна-тэхналагічнай сістэмы навучання і тэставага кантролю, уяўляецца істотным абмеркаванне такіх метадычных аспектаў, як эфектыўнасць канкрэтных метадаў навучання і вучэбных матэрыялаў, тып і якасць беларускамоўнага дыскурсу, эфектыўнасць навучальнай мадэлі на тым ці іншым узроўні. Патрабуюць педагагічнай рэфлексіі праблемныя кірункі ў галіне методыкі вывучэння і выкладання БМЗ, звязаныя з інтэрпрэтацыяй ключавых кампетэнцый у складзе беларускамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі; псіхалінгвістычныя і сацыялінгвістычныя асновы камунікатыўна арыентаванага навучання; стылі педагагічных стасункаў у працэсе навучання; класіфікацыя формаў і відаў экзаменацыйнага кантролю; вызначэнне крытэрыяў ацэнкі паспяховасці рэалізацыі кірункаў навучальнай дзейнасці і інш.

Узроўневы падыход да выкладання БМЗ, арыентаваны на прынцып бесперапыннага і індывідуалізаванага навучання, прадугледжвае выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій і новых спосабаў аказання адукацыйных паслуг, як, напрыклад, дыстанцыйнае навучанне з адпаведнай падтрымкай, інтэрнэт-тэхналогіі і інш., якія ўлічвалі б патрэбы розных кантынгентаў замежных карыстальнікаў беларускай мовай (выкладчыкаў БМЗ, прадстаўнікоў беларускай дыяспары і інш.). Дзеля забеспячэння дыстанцыйнай формы навучання асэнсаванне і засваенне праграмнага матэрыялу мае ажыццяўляцца праз інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы – электронныя канспекты лекцый, лекцыі-прэзентацыі, іншыя дыдактычныя, метадычныя, даведачныя сродкі, матэрыялы для тэсціравання.

Навукова-метадычнае асэнсаванне ў сістэме дадатковай адукацыі прафесійных задач, што вызначаюць адмысловасць педагагічнай дзейнасці ў парадыгме ўзроўневага навучання БМЗ з далейшай сертыфікацыяй узроўняў валодання мовай дапамагае ўдасканаліць кампетэнцыі выкладчыкаў у рэалізацыі на практыцы сістэмы ўзроўняў як інавацыйнай педагагічнай тэхналогіі дасягнення стандартаў адукацыі.

Усталяванне Дзяржаўнай сістэмы сертыфікацыі ўзроўняў валодання БМЗ варта разглядаць як фактар пазітыўнага ўплыву на дыяпазон метадаў навучання беларускай мове, арыентаваных на індывідуалізацыю, а таксама на развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў сістэме дадатковага навучання, пашырэнне ў міжнароднай адукацыйнай прасторы беларускамоўнага адукацыйнага асяродку і сферы беларускамоўных адукацыйных паслуг.